# Голас душы

Яднанне ў любові

№ 8 (533)
Субота, 3 верасня 2016 г.

Штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь


## ПАПА РЫМСКІ СПАДЗЯЕЦЦА, ШТО ЗНОЙДЗЕЦЦА ЧАС І МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ ЯГО ВІЗІТУ Ў БЕЛАРУСЬ

*18 жніўня 2016 г. ў Беларусь прыбыў новы Апостальскі Нунцый арцыбіскуп Габар Пінтэр. Самалёт з іерархам на борце прызямліўся ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» удзень*




Прывітаць Апостальскага Нунцыя ў залу чакання прыбылі ўсе члены Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі на чале з яе Старшынёй Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім арцыбіскупам Тадэвушам Кандрусевічам.

«Я вельмі рады ступіць нарэшце на беларускую зямлю. Было вельмі цікава назіраць з самалёта, якая ж прыгожая краіна Беларусь! У многім яна нагадала мне пра Венгрыю – так шмат палёў таксама і ў маёй краіне, – сказаў прадстаўнік Папы. – На гэты момант я на 100 працэнтаў гатовы да працы на карысць Касцёла ў Беларусі, для вашай краіны і для людзей у ёй. Але гэта не толькі заданне – гэта яшчэ і радасць для мяне».

Гаворачы пра свой прыезд у Беларусь, арцыбіскуп Габар Пінтэр адзначыў, што гэта больш, чым проста візіт:

«Гэта не толькі візіт, я застаюся тут. Цікава атрымалася з фармулярам, які мне трэба было запоўніць у самалёце, – да якой даты я тут прабуду. Запаўняючы яго, я нічога не напісаў, таму што застануся тут – спадзяюся, на доўгі час (*усміхаецца – заўв. аўт.*)».

*Працяг на стар. 2*

# ПАПА РЫМСКІ СПАДЗЯЕЦЦА, ШТО ЗНОЙДЗЕЦЦА ЧАС І МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ ЯГО ВІЗІТУ Ў БЕЛАРУСЬ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*

Іерарх дадаў, што яго першапачатковай задачай стануць сустрэчы з біскупамі, святарамі, вернікамі і прадстаўнікамі дзяржаўнай улады.

«Спачатку я павінен увайсці ў курс справаў па многіх рэчах – становішча вернікаў у Касцёле, дыялог з Праваслаўнай Царквой і інш., – падкрэсліў прадстаўнік Папы. – У першыя чатыры–шэсць месяцаў маім заданнем стане знаёмства з Касцёлам у Беларусі і людзьмі тут – палітыкамі, біскупамі, вернікамі, святарамі, манахінямі...

Прыблізна ў кастрычніку адбудзецца сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі. Найперш я павінен пазнаёміцца з той рэальнасцю, якая ёсць у Беларусі. Пазней прыйдуць і іншыя задачы».







Прыгадваючы апошнюю сустрэчу з Папам Францішкам, Апостальскі Нунцый адзначыў, што размаўляў са Святым Айцом нядаўна:

«Я бачыўся з Папам Францішкам 13 дзён таму, і практычна першым, аб чым зайшла гаворка, быў апошні візіт Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Рым і яго сустрэча з Пантыфікам, а таксама запрашэнне ў Беларусь. Папа Рымскі сказаў, што мы знойдзем час і магчымасць для гэтага візіту (Заўвага – словы Нунцыя ў гэтым месцы пададзены недакладна. Правільны варыянт гучыць так: "Папа Рымскі сказаў, што спадзяецца, што знойдзецца час і магчымасць для гэтага візіту"). Я не магу сказаць, калі або як, але думаю, што сказанае Пантыфікам – штосьці пазітыўнае для Беларусі».

*Ільля Лапато,*
*фота Аляксандры Шчыглінскай*
*Паводле Catholic.by*

# «У ІМ ДАМІНАВАЎ ПОГЛЯД, ПОЎНЫ ЛЮБОВІ ДА ЛЮДЗЕЙ ІНШЫХ ВЕРАВЫЗНАННЯЎ»

*26 жніўня 2016 г. ў Нясвіжы прайшла навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная Слузе Божаму Эдварду Вайніловічу, адным з арганізатараў якой выступіў пробашч мінскай парафіі Св. Сымона і Св. Алены кс. Уладыслаў Завальнюк.*

На пачатак канферэнцыі было зачытана прывітальнае слова Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча.

У сваім звароце, які адкрываў канферэнцыю, іерарх адзначыў, што Эдвард Вайніловіч увайшоў у гісторыю не толькі як будаўнік Чырвонага касцёла ў Мінску, але і як дзяржаўны дзеяч, добры гаспадар і чалавек, які імкнуўся да развіцця міжхрысціянскага і міжрэлігійнага дыялогу.

«Ужо стагоддзе таму ён адчуваў патрэбу пошуку еднасці як паміж хрысціянамі, так і паміж вернікамі розных рэлігій. Для ажыццяўлення гэтай сваёй думкі Эдвард Вайніловіч фінансаваў будову не толькі каталіцкіх святынь, але таксама праваслаўных, габрэйскіх і мусульманскіх. І гэта цэлае стагоддзе таму!»

«Памяркоўны беларус будуе сваё жыццё не на прынцыпе «хто каго», а на законе любові, імкнучыся ў кожным чалавеку бачыць свайго брата ці сястру. Сілы для гэтага ён чэрпае з духоўных каштоўнасцяў, якія сваім жыццём сведчыў Эдвард Вайніловіч», – падкрэсліў Мітрапаліт.

Паводле слоў арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча, маляўнічы Нясвіжскі край абраны месцам правядзення навукова-практычнай канферэнцыі нездарма, бо гэты край вядомы сваёй талерантнасцю адносна людзей розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў.

«У гэтым годзе мы адзначалі 400-годдзе смерці будаўніка Нясвіжа з яго славутым замкам і касцёлам Божага Цела, князя Мікалая Радзівіла Сіроткі, чалавека шырокіх поглядаў. Але ён, стаўшы католікам, будаваў святыні і для вернікаў іншых канфесій і займаўся дабрачыннасцю. Сваёй дзейнасцю ён таксама пакінуў глыбокі след на нашай зямлі», – заўважыў іерарх.




Арцыпастыр дадаў, што Слуга Божы Эдвард Вайніловіч унёс важкі ўклад у развіццё міжканфесійнага дыялогу, што афіцыйна пацвярджаюць Дэкрэт пра экуменізм «Unitatis redintegratio» і Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій «Nostra aetate».

Як адзначыў іерарх, у сённяшніх умовах, калі на карце Еўропы бачныя не толькі крыж, але і паўмесяц, Слуга Божы Эдвард Вайніловіч можа служыць прыкладам, бо «ў ім дамінаваў шырокі, поўны любові і адкрытасці на людзей іншых веравызнанняў і культур погляд».

На завяршэнне арцыбіскуп выказаў надзею, што канферэнцыя зможа дапамагчы яшчэ лепш зразумець багатую культурную і духоўную спадчыну, якую пакінуў Эдвард Вайніловіч, а таксама гісторыю Беларусі.

*Паводле Catholic.by*

# СЛОВА МІТРАПАЛІТА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА АДКРЫЦЦІ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ «БЕЛАРУСЬ, НЯСВІЖСКІ КРАЙ І ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ»



Глыбокапаважаны прэзідыўм, браты і сёстры, удзельнікі прысвечанай нашай Бацькаўшчыне, маляўнічаму Нясвіжскаму краю і Слузе Божаму Эдварду Вайніловічу навукова-практычнай канферэнцыі!

Сардэчна вітаю ўсіх вас і дзякую арганізатарам гэтага форуму, якія праявілі своечасовую ініцыятыву. Не так даўно ў мінскай святыні Св. Сымона і Св. Алены адбылася знакавая для Каталіцкага Касцёла і Беларусі падзея – распачацце беатыфікацыйнага працэсу Слугі Божага Эдварда Вайніловіча, фундатара гэтай святыні, якая з'яўляецца візітнай карткай сталіцы Беларусі.

Ён увайшоў у нашу супольную гісторыю не толькі як будаўнік Чырвонага касцёла ў Мінску, але таксама як дзяржаўны дзеяч, добры гаспадар і чалавек, які імкнуўся да развіцця міжхрысціянскага і міжрэлігійнага дыялогу.

Ужо стагоддзе таму ён адчуваў патрэбу пошуку еднасці як паміж хрысціянамі, так і паміж вернікамі разных рэлігій. Мы ўсе жыхары адной зямлі і яна наш супольны дом, у якім павінна быць месца ўсім.

Для ажыццяўлення гэтай сваёй думкі Эдвард Вайніловіч спансараваў будову не толькі каталіцкіх святынь, але таксама праваслаўных, габрэйскіх і мусульманскіх. І гэта цэлае стагоддзе таму! Які праніклівы погляд на рэальнасць нашай краіны, у якой стагоддзямі мірна жывуць людзі розных веравызнанняў і нацыянальнасцяў.

Гэтым самым Эдвард Вайніловіч унёс важкі ўклад у развіццё дыялогу і адносін паміж людзьмі розных веравызнанняў, што афіцыйна было пацверджана Касцёлам на ІІ Ватыканскім Саборы ў Дакрэце пра экуменізм «Unitatis redintegratio» і Дэкларацыі пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій «Nostra aetate».

У сучасным свеце побач жывуць людзі розных веравызнанняў, культур і цывілізацый, веруючыя і няверуючыя. Наша планета – гэта наш агульны дом, і ад нас залежыць, якім ён будзе і ў якім нам давядзецца жыць. Выклікі сучаснасці, асабліва міграцыя і праблема бежанцаў, якая звалілася на Еўропу як снег на галаву і якая вядзе да фундаментальных зменаў ва ўспрыманні Старога Свету, патрабуюць новага асэнсавання адносін паміж людзьмі не толькі розных веравызнанняў, але таксама культур і нават цывілізацый.

На ландшафце Еўропы сёння не толькі крыж, але і паўмесяц. Гэта рэальнасць, якую трэба браць пад увагу. А для гэтага неабходна навучыцца жыць у новых абставінах, каб на прынцыпах павагі да людзей іншых, нетрадыцыйных для Еўропы веравызнанняў і культур, будаваць новы еўрапейскі дом.

Прыкладам можа служыць Слуга Божы Эдвард Вайніловіч. Дадзеныя яму Богам таленты палітыка, гаспадара, будаўніка ён умацоўваў глыбокай верай. Менавіта таму ў яго дамінаваў шырокі, поўны любові і адкрытасці на людзей іншых веравызнанняў і культур погляд. Прыкладам таксама могуць служыць сучасныя адносіны паміж людзьмі розных веравызнанняў у Беларусі, якія прыемна здзіўляюць жыхароў многіх краін Еўропы. Памяркоўны беларус будуе сваё жыццё не на прынцыпе «хто каго», а на законе любові, імкнучыся ў кожным чалавеку бачыць свайго брата ці сястру. Сілы для гэтага ён чэрпае з духоўных каштоўнасцяў, якія сваім жыццём сведчыў Эдвард Вайніловіч.

Прыкметна, што канферэнцыя адбываецца ў маляўнічым Нясвіжскім краі, які вядомы сваёй талерантнасцю адносна людзей розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. У гэтым годзе мы адзначалі 400-годдзе смерці будаўніка Нясвіжа з яго славутым замкам і касцёлам Божага Цела, як шэдэўра сакральнай культуры, князя Мікалая Радзівіла Сіроткі, чалавека шырокіх поглядаў. Але ён, стаўшы католікам, будаваў святыні і для вернікаў іншых канфесій і займаўся дабрачыннасцю. Сваёй дзейнасцю ён таксама пакінуў глыбокі след на нашай зямлі.

Выказваю надзею, што канферэнцыя, якая распачынаецца, дапаможа яшчэ лепей зразумець багатую культурную і духоўную спадчыну, якую пакінулі нам Эдвард Вайніловіч і наша багатая і адначасова трагічная гісторыя, каб, вучачыся на ёй, мы будавалі поўнае ўзаемапавагі і любові да бліжняга грамадства.

Малітоўна ад усяго сэрца жадаю поспехаў у працы гэтага нясвіжскага форуму.

*З благаслаўленнем*
*Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч*

# ДУХОЎНАЕ ЎСЫНАЎЛЕННЕ НЕНАРОДЖАНАГА ДЗІЦЯЦІ

Ва ўрачыстасць Звеставання Пана вернікі ва ўсіх парафіях Беларусі могуць далучыцца да «Духоўнага ўсынаўлення» – малітоўнай акцыі па абароне зачатага жыцця, якое знаходзіцца пад пагрозай знішчэння. Дарэчы, калі ў вас не атрымалася духоўна ўсынавіць дзіця ў гэты дзень, зрабіць гэта можна ў любы іншы час.

Духоўнае ўсынаўленне з'явілася пасля аб'яўленняў у Фаціме і стала адказам на заклік Маці Божай да ружанцовай малітвы, пакаяння і кампенсацыі за грахі, якія найбольш раняць Яе Беззаганнае Сэрца. У Беларусі традыцыя духоўнага ўсынаўлення пачалася ў сярэдзіне 1990-х гадоў. Дзякуючы веруючым людзям у нашай краіне за апошні час у некалькі разоў паменшылася колькасць абортаў, бо малітва – наймацейшая зброя.



### Што такое Духоўнае ўсынаўленне?

Духоўнае ўсынаўленне – гэта малітва ў інтэнцыі дзіцяці, якому пагражае смерць ва ўлонні маці. Малітва працягваецца дзевяць месяцаў і складаецца з чытання адной ружанцовай таямніцы – радаснай, балеснай ці хвалебнай («Ойча наш» і 10 «Вітай, Марыя»), а таксама спецыяльнай малітвы ў інтэнцыі дзіцяці і яго бацькоў. Да малітваў можна далучыць індывідуальна выбраныя добрыя ўчынкі.

Дадатковымі ўчынкамі могуць быць: частая споведзь і Святая Камунія, адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту, чытанне Святога Пісання, пост, змаганне з дрэннымі звычкамі, дапамога бедным, дадатковыя малітвы. Аднак дадатковыя ўчынкі не з'яўляюцца абавязковымі.

### Хто можа духоўна ўсынаўляць?

Духоўна ўсынаўляць можа кожны. Свецкія, кансэкраваныя асобы, мужчыны, жанчыны, людзі любога ўзросту. Толькі дзеці распачынаюць Духоўнае ўсынаўленне пад апекай бацькоў.

Асобы, якія жывуць у несакрамэнтальных саюзах, разведзеныя, а таксама тыя, якія не ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы, – асобы вельмі пажылога ўзросту, хворыя, з фізічнымі адхіленнямі таксама могуць маліцца за ненароджанае дзіця.

### Якую карысць прыносіць Духоўнае ўсынаўленне?

Духоўнае ўсынаўленне лечыць глыбокія духоўныя раны, нанесеныя грахом аборту. Яно дазваляе ўсім маці аднавіць веру ў Божую Міласэрнасць і прыносіць спакой у іх сэрцы. Усынаўленне як вельмі канкрэтны, бескарысны і асабісты дар (малітвы, ахвяры і посту), дапамагае (асабліва маладым людзям) фарміраваць характар, змагацца з эгаізмам, знаходзіць радасць адказнага бацькоўства, даючы магчымасць бачыць любоў і сэкс вачыма Бога. Навучаючы сістэматычнай малітве, яно паглыбляе кантакт з Богам; дапамагае адкрываць глыбокі сэнс занядбаных аскетычных практыкаў; можа стаць тым элементам, які адродзіць супольную малітву і любоў у сем'ях. Трэба таксама памятаць у сваіх малітвах пра ўсыноўленых дзяцей на працягу ўсяго жыцця – яны сталіся нашымі дзецьмі.

### Умовы духоўнага ўсынаўлення

У духоўным усынаўленні можна ўдзельнічаць штогод, пры ўмове, што папярэднія абавязацельствы выкананыя. Да такой малітвы трэба ставіцца з адказнасцю і не прапускаць ніводнага дня на працягу дзевяці месяцаў.

На працягу дзевяці месяцаў можна ўсынавіць толькі адно дзіця.

### Ці абяцанні Духоўнага ўсынаўлення павінны быць дадзеныя выключна ў касцёле ў прысутнасці святара?

Рэкамендуецца, каб абяцанні былі дадзены ўрачыста, але можна іх даць таксама і прыватна.

*Працяг на стар. 6*

# ДУХОЎНАЕ ЎСЫНАЎЛЕННЕ НЕНАРОДЖАНАГА ДЗІЦЯЦІ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 5*

Прыватныя абяцанні можна скласці, прачытаўшы формулу абяцання (лепш за ўсё перад крыжам ці абразом). З гэтага моманту на працягу чарговых дзевяці месяцаў трэба маліцца адной індывідуальна выбранай таямніцай ружанца, а таксама малітвай у інтэнцыі дзіцяці і бацькоў. Каб запомніць, рэкамендуецца запісаць дату распачацця і заканчэння малітвы.



**Ці трэба перапыняць Духоўнае ўсынаўленне, калі малітва была занядбаная на працягу доўгага часу?**

Перапынак на працягу доўгага часу (месяц, два) спыняе Духоўнае ўсынаўленне. У гэтым выпадку трэба зноў даць абяцанне і імкнуцца яго стрымаць. У выпадку кароткага перапынку трэба працягваць Духоўнае ўсынаўленне, павялічваючы малітву на колькасць прапушчаных дзён.

Калі ў які-небудзь дзень адаптуючы забудзе прачытаць малітву, гэта не будзе грахом. Грахом з'яўляецца свядомае і дабравольнае занядбанне складзенага Богу абяцання.

*Паводле Catholic.by, Ave Maria*

## ФОРМУЛА АБЯЦАННЯ ДУХОЎНАГА УСЫНАЎЛЕННЯ

**Усе разам**:

«Праслаўляю Цябе, Ойча, Пане неба і зямлі, што Ты схаваў гэтыя рэчы ад мудрых і разважлівых, а аб'явіў іх дзецям. Так, Ойча, бо такім было Тваё ўпадабанне».

Паўтараем за святаром ці кожны асобна:

«Найсвяцейшая Панна, Багародзіца Марыя, усе Анёлы і Святыя. Ідучы за жаданнем несці дапамогу ў абароне ненароджаных, я, ________________ моцна пастанаўляю і абяцаю, што з дня _______ у свята/урачыстасць ______________ Духоўна ўсынаўляю адно дзіця, імя якога ведае адзін толькі Бог, каб на працягу дзевяці месяцаў кожны дзень маліцца аб уратаванні яго жыцця, а таксама аб справядлівым і добрым жыцці пасля нараджэння. Гэтымі малітвамі будуць:

– ***адна таямніца ружанца***;

– ***мае добрыя ўчынкі***;

– ***малітва, якую прачытаю сёння першы раз***».

## ШТОДЗЁННАЯ МАЛІТВА

Пане Езу, праз заступніцтва Марыі, Маці Тваёй, якая нарадзіла Цябе з любоўю, а таксама праз заступніцтва св. Юзафа, чалавека даверу, які апекаваўся Табою пасля народзінаў, – прашу Цябе ў інтэнцыі гэтага ненароджанага дзіцяці, якое духоўна хачу ўсынавіць і якое знаходзіцца ў небяспецы аборту. Прашу, дай яго бацькам любоў і адвагу, каб яны не забівалі свайго дзіцяці, а пакінулі яму жыццё, якое Ты сам гэтаму дзіцяці прадвызначыў. Амэн.

# ПАПА НА ПЕНСІІ БЕНЕДЫКТ XVI РАСПАВЁЎ АБ ПРЫЧЫНЕ СЫХОДУ З ПАСАДЫ БІСКУПА РЫМА

*Папа на пенсіі Бенедыкт XVI у інтэрв'ю італьянскай газеце «La Repubblica» распавёў аб прычынах свайго адмаўлення ад пасады Біскупа Рыма, а таксама пра сардэчныя і сяброўскія адносіны з Папам Францішкам.*



Паводле слоў Пантыфіка на пенсіі, нягледзячы на жаданне «давесці да канца Год веры» і скончыць чарговую энцыкліку, ён адчуваў сябе вельмі стомленым.

Акрамя таго, былі запланаваны Сусветныя дні моладзі ў Рыа-дэ-Жанейра, на якіх, «паводле ўстаноўкі Яна Паўла II, фізічная прысутнасць Папы была неад'емнай».

**Абмежаванасць сіл**

«Пасля падарожжа ў Мексіку і на Кубу я больш не адчуваў сябе ў стане здзейсніць настолькі складанае падарожжа», – прызнаўся Папа на пенсіі і дадаў, што менавіта тады, у сакавіку 2012 г., моцна адчуў абмежаванасць сваіх фізічных сіл.

«Перш за ўсё я зразумеў, што больш не ў стане пераносіць трансатлантычныя пералёты па прычыне змены часавых паясоў. Канешне, я размаўляў аб гэтых праблемах з маім урачом, прафесарам Патрыцыё Паліска. Такім чынам, станавілася ясна, што я больш не буду ў стане браць удзел у Сусветных днях моладзі ў Рыа-дэ-Жанейра летам 2013 г., бо гэтаму перашкаджала праблема часавых паясоў. Ад таго часу я павінен быў у адносна кароткі тэрмін прыняць рашэнне аб даце майго сыходу», – распавёў Бенедыкт XVI.

Сёння Пантыфік на пенсіі быў упэўнены, што без яго прысутнасці «Год веры пройдзе добра». «Я меў моцнае перакананне, што мой наступнік, як і адбылося пазней, зможа аднолькава добра давесці да канца пажаданую Панам ініцыятыву, якую пачаў я», – сказаў Бенедыкт XVI.

**Папа Бенедыкт XVI і Папа Францішак**

Каментуючы выбар кляштара «Mater Ecclesiae» у якасці сваёй рэзідэнцыі, Бенедыкт XVI спаслаўся на жаданне Яна Паўла II, паводле якога гэтае месца павінна было быць месцам малітвы, «як крыніца жывой вады ў Ватыкане».

Таму ў ім па чарзе пражывалі прадстаўніцы розных кляўзуровых жаночых манаскіх супольнасцяў. У 2012 г. манахіні пакінулі кляштар па прычыне яго рамонту. Тады Бенедыкт XVI вырашыў заняць іх месца і адсюль працягваць служыць Касцёлу малітвай.

Папа на пенсіі распавёў, што акрамя падтрымкі, якую адчуваў ад Езуса, Маці Божай і святых спадарожнікаў яго жыцця – св. Аўгустына, св. Банавентуры, св. Бенедыкта і св. Францішка, – вельмі важнай была падтрымка людзей, ад якіх ён атрымліваў вялікае мноства лістоў з добрымі словамі і абяцаннямі малітвы.

Гаворачы пра адносіны з Папам Францішкам, Бенедыкт XVI заўважыў, што яго паслухмянасць «ніколі не ставілася пад пытанне».

Акрамя гэтага, іх злучае моцнае сяброўства. «У момант яго абрання, як і многія іншыя, я адчуў спантаннае пачуццё ўдзячнасці да Божага Провіду. Пасля двух Пантыфікаў з Цэнтральнай Еўропы Бог, калі так можна сказаць, скіраваў позірк на Паўсюдны Касцёл і заклікаў нас да больш шырокай еднасці, больш каталіцкай», – адзначыў Пантыфік на пенсіі.

Бенедыкт XVI назваў асабістыя адносіны з Папам Францішкам «бацькоўска-братэрскімі». Паводле яго слоў, цяперашні Папа часта дасылае яму маленькія падарункі, асабістыя лісты і наведвае перад падарожжамі.

Бенедыкт XVI завяршыў служэнне на пасадзе Біскупа Рыма 28 лютага 2013 г. Папа Францішак стаў яго наступнікам 13 сакавіка 2013 г.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# «МІЛАСЭРНАСЦЬ – ШЛЯХ, ПРАКЛАДЗЕНЫ АД СЭРЦА ДА РУК»

*Сустрэча міласэрнасці Бога з пакутамі чалавецтва была тэмай катэхезы Папы Францішка на агульнай аўдыенцыі ў Ватыкане 10 жніўня 2016 г. Пантыфік спаслаўся на евангельскі ўрывак пра ўваскрашэнне Езусам сына ўдавы з Наіна (Лк 7, 12–16)*

«Сэрцам гэтага апавядання з'яўляецца не цуд, але спагада Езуса да маці гэтага юнака. Міласэрнасць тут набывае імя спачування да жанчыны, якая згубіла мужа і зараз суправаджае на могілкі свайго адзінага сына. Гэты вялікі боль маці ўзрушвае Езуса і правакуе Яго на здзяйсненне цуду ўваскрашэння», – заўважыў Святы Айцец.

Папа падкрэсліў, што менавіта міласэрнасць і спагада да жанчыны падштурхнулі Хрыста да такога надзвычайнага жэсту. «"Убачыўшы яе, Пан зліtаваўся над ёю і сказаў: "Не плач!" І, падышоўшы, дакрануўся да насілак". Вялікае спачуванне кіруе ўчынкамі Езуса: Ён спыніў працэсію, дакрануўшыся да насілак, і, кіруючыся глыбокай міласэрнасцю да гэтай маці, вырашыў паўстаць супраць смерці, калі так можна сказаць, тварам у твар. Затым Ён канчаткова паўстане супраць яе на крыжы», – адзначыў Пантыфік.



Папа заклікаў вернікаў памятаць пра ўваскрашэнне Хрыстом юнака з Наіна, калі яны будуць праходзіць праз Святыя дзверы, несучы з сабой уласныя радасці і пакуты, задумы і няўдачы, сумнівы і страхі.

«Гэта дзверы сустрэчы паміж пакутамі чалавецтва і спачуваннем Езуса. Падумаем пра гэта: сустрэча паміж пакутамі чалавецтва і спачуваннем Езуса. Пераступіўшы іх парог, мы здзяйсняем пілігрымку ўнутр міласэрнасці Бога, які, як памерламу юнаку, паўтарае ўсім: "Кажу табе, устань!" Кожнаму з нас Ён кажа: "Устань!" Бог хоча, каб мы стаялі на нагах. Ён стварыў нас для гэтага. (...) Праходзячы праз Святыя дзверы, будзем спрабаваць пачуць у нашым сэрцы гэтае слова: "Устань!" Моцнае слова Езуса можа дапамагчы нам ўзняцца і ажыццявіць пераход ад смерці да жыцця. Яго слова ажыўляе нас, дорыць надзею, падбадзёрвае стомленыя сэрцы, адкрывае на такое бачанне свету і жыцця, якое сягае далей за пакуты і смерць. На Святых дзвярах для кожнага з нас выгравіраваны невычэрпны скарб Божай міласэрнасці!» – заўважыў Святы Айцец.

Папа пажадаў вернікам, каб сустрэча з міласэрнасцю Пана, якая вядзе да збаўлення і дае новае жыццё, падштурхоўвала да ўчынкаў міласэрнасці. «Міласэрнасць – гэта шлях, пракладзены ад сэрца да рук!» – сказаў Пантыфік.

Вітаючы вернікаў, Папа звярнуў увагу на актуальнасць вучэння св. Дамініка, успамін якога Касцёл адзначаў два дні таму. Заснаваны ім Ордэн прапаведнікаў адзначае сёлета 800-годдзе з дня зацвярджэння. «Няхай мудрыя словы вялікага святога стымулююць вас, маладыя людзі, слухаць і жыць вучэннем Езуса, няхай яго ўнутраная сіла духу падтрымлівае вас, дарагія хворыя, у хвіліны смутку, а яго апостальская адданасць нагадвае вам, маладыя сужэнцы, пра важнасць хрысціянскага выхавання ў вашай сям'і», – пажадаў Пантыфік.

У агульнай аўдыенцыі прынялі ўдзел каля 9 тыс. чалавек. Па прычыне спякотнага надвор'я яна праходзіла не на плошчы св. Пятра, а ў ватыканскай Зале Паўла VI.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# «СЁННЯ ЕЗУС СТАНОВІЦЦА ГОЛАСАМ ТЫХ, ХТО ЯГО ПАЗБАЎЛЕНЫ»

*«Езус звяртаецца да кожнага з нас з заклікам адкрыць свае сэрцы і зрабіць нашымі пакуты і клопаты бедных, галодных, адкінутых, уцекачоў, якім не пашчасціла ў жыцці», – сказаў Папа Францішак перад малітвай «Анёл Панскі» ў Ватыкане 28 жніўня 2016 г.*

Таксама Святы Айцец выказаў удзячнасць добраахвотнікам, якія працуюць у сталоўках для самотных і бяздомных.

«Урывак з сённяшняга Евангелля расказвае нам пра Езуса, які прыйшоў у дом аднаго з кіраўнікоў фарысеяў, і назіраў, як госці, запрошаныя на абед, выбіралі першыя месцы. Гэта сцэна, якую мы бачылі шмат разоў: калі многія імкнуцца заняць лепшае месца, штурхаючыся локцямі. Бачачы гэтую сцэну, Ён расказвае дзве кароткія прыпавесці, з якімі прапануе два ўказанні: адно тычыцца месца за сталом, другое – узнагароды.

Першае параўнанне тычыцца вясельнага банкету. Езус кажа: Калі нехта пакліча цябе на вяселле, не сядай на першае месца, каб не аказалася, што нехта з пакліканых ім больш ганаровы за цябе, і каб той, хто запрасіў і яго, і цябе, не падышоў і не сказаў табе: Саступі яму месца… А калі цябе запросяць, прыйдзі і сядай на апошняе месца» (Лк 14, 8–9). Гэтымі рэкамендацыямі Езус не намерваецца даваць правілы паводзінаў, але даць урок пра каштоўнасць пакоры. Гісторыя вучыць, што пыха, кар'ерызм, ганарыстасць, хвальба з'яўляюцца прычынай шматлікага зла. І Езус дае нам зразумець, што трэба выбіраць апошняе месца, быць сціплым і не паказвацца. Пакора. Калі мы станем перад Богам у гэтым вымярэнні пакоры, тады Бог нас узвышае, нахіляецца да нас, каб узняць нас да сябе; «Бо кожны, хто ўзвышае сябе, будзе паніжаны, а хто паніжае сябе, узвысіцца» (Лк 14, 11).

Словы Езуса падкрэсліваюць паводзіны, зусім розныя і супрацьлеглыя: паводзіны тых, хто выбірае ўласнае месца, і паводзіны тых, хто пакідаюць яго вызначэнне Богу і чакаюць узнагароды ад Яго. Не забывайма пра гэта: Бог плаціць значна больш, чым людзі! Ён дае нам месца больш прыгожае, чым тое, што што даюць нам людзі! Месца, якое дае нам Бог, блізка да Яго сэрца, і Яго ўзнагарода – гэта вечнае жыццё. «І шчаслівы будзеш... бо адплаціцца табе ў дзень уваскрасення справядлівых» (Лк 14, 14).

У другой прыпавесці, у якой Езус паказвае на адсутнасць бескарыслівасці, характэрнай для гасціннасці, Ён кажа: «Калі наладжваеш гасціну, кліч убогіх, калекаў, кульгавых, невідушчых, і шчаслівы будзеш, што яны не маюць як адплаціць табе» (Лк 14, 13–14). Справа ў тым, каб выбіраць неаплатную ўзнагароду, чым выгодныя для сябе рахункі, як тыя, што імкнуцца атрымаць узнагароду, яшчэ больш узбагаціцца.Сапраўды бедныя і простыя людзі, тыя, якіх прызнаюцца за нішто, ніколі не змогуць аднавіць запрашэнне на абед. Такім чынам, Езус паказвае сваю перавагу да бедных і адрынутых, якія з'яўляюцца прывілеяванымі Валадарства Божага, і перадае пасланне Евангелля, якое наказвае служыць бліжняму дзеля любові да Бога. Сёння Езус становіцца голасам тых, хто яго пазбаўлены, і звяртаецца да кожнага з нас з заклікам адкрыць свае сэрцы і зрабіць нашымі пакуты і клопаты бедных, галодных, адкінутых, уцекачоў, якім не пашчасціла ў жыцці, якія прайгралі сваё жыццё, тых, што адкінуты грамадствам і пыхай наймацнейшых. А гэтыя адкінутыя з’яўляюцца пераважнай большасцю насельніцтва.

У гэты момант я з удзячнасцю думаю пра сталоўкі, у якіх шматлікія добраахвотнікі выконваюць сваё служэнне, даючы ежу самотным, тым, якія жывуць у нястачы, беспрацоўным або бяздомным. Гэтыя сталовыя з’яўляюцца трэніровачнымі месцамі міласэрнасці. Яны распаўсюджваюць культуру гасціннасці, таму што тыя, хто працуе ў іх, сталі поўнымі любові да Бога і прасветленымі мудрасцю Евангелля. Такім чынам служэнне братам становіцца сведчаннем любові, якая робіць надзейнай і бачнай любоў Хрыста.

Папросім Панну Марыю, каб вяла нас кожны дзень па шляху пакоры, каб зрабіла нас здольнымі да бескарыслівага прыняцця і салідарнасці з адкінутымі асобамі, каб мы станавіліся годнымі боскай узнагароды», – сказаў Папа.

Пасля малітвы Пантыфік нагадаў, што 27 жніўня ў Сант’яга дэль Эстэро была ўзнесена да хвалы алтара Марыя Антонія-дэ-Сан-Хасэ. Папа пажадаў, каб «яе ўзорнае хрысціянскае сведчанне, асабліва яе апостальства ў арганізацыі рэкалекцый, выклікала імкненне да больш цеснай сувязі з Хрыстом і Евангеллем».

Святы Айцец таксама нагадаў, што 1 верасня будзе адзначацца Сусветны дзень малітвы аб ахове стварэння, разам з «нашымі праваслаўнымі братамі і членамі іншых рэлігійных супольнасцяў». «Гэта будзе нагода ўзмацніць агульную прыхільнасць да абароны жыцця, у павазе да навакольнага асяроддзя і прыроды», – сказаў Пантыфік.На заканчэнне Папа заклікаў вернікаў маліцца за яго і ўдзяліў сабраным на ватыканскай плошчы благаслаўленне.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# ЕЗУС ЖАДАЕ, КАБ АГОНЬ СВЯТОГА ДУХА ЗАГАРЭЎСЯ Ў НАШЫХ СЭРЦАХ

*14 жніўня 2016 г. перад малітвай «Анёл Панскі» ў Ватыкане Папа Францішак разважаў над чытаннем Евангелля на гэтую нядзелю, дзе Езус звяртаецца да вучняў са словамі, якія падкрэсліваюць, што Касцёлу патрэбны не бюракраты, а місіянеры суцяшальнага паслання міласэрнасці*



«Евангелле гэтай нядзелі (Лк 12, 49–53) належыць да вучэння Езуса, звернутага да вучняў падчас Яго ўезду ў Ерузалем, дзе Яго чакае смерць на крыжы, – нагадаў Папа. – Для таго, каб паказаць мэту сваёй місіі, Ён выкарыстоўвае тры вобразы: агню, хросту і раздзялення. Сёння я хацеў бы пагаварыць пра першы вобраз – агню.

Езус выказвае гэта словамі: “Агонь прыйшоў Я кінуць на зямлю і як жа хачу, каб ён ўжо разгарэўся” (Лк 12, 49). Агонь, пра які кажа Езус, – гэта агонь Святога Духа, жывая і дзейсная ў нас з дня нашага хросту прысутнасць. Гэты агонь, творчая сіла, якая ачышчае і амаладжвае, спальвае ўсе чалавечыя пакуты, увесь эгаізм, увесь грэх, ператвараючы нас знутры, рэгенеруе і робіць нас здольнымі любіць. Езус жадае, каб Святы Дух загарэўся ў нашых сэрцах, як агонь, таму што толькі ад сэрца – звярніце ўвагу на гэта: толькі ад сэрца – агонь любові можа пашырацца і выклікаць развіццё Божага Валадарства. Не пачынаецца ў галаве, але ідзе ад сэрца. Вось чаму Езус жадае, каб агонь прыйшоў у нашыя сэрцы.

Калі мы адкрыемся цалкам на дзеянне Святога Духа, Ён дасць нам адвагу і энтузіязм, каб абвяшчаць усім Езуса і Яго суцяшальнае пасланне міласэрнасці і збаўлення, выплываючы ў мора, без страху. Гэты агонь пачынаецца ў сэрцы. Касцёл, а значыць мы ўсе, выконваючы сваю місію ў свеце, мае патрэбу ў дапамозе Святога Духа, каб яго не абмяжоўваў страх і карыслівасць, каб ён не прывыкаў да хады ў абшары бяспечных межаў. Гэтыя два стаўленні вядуць Касцёл да функцыянерства, пазбягання рызыкі. У той час як апостальская мужнасць, што запальвае Святы Дух у нас, як агонь, дапамагае нам пераадольваць перашкоды і муры, робіць творчымі і стымулюе выйсці і крочыць шляхамі недаследаванымі і нязручнымі, даючы надзею тым, каго сустракаем.

З гэтым агнём Святога Духа мы пакліканы станавіцца ўсё больш і больш супольнасцю людзей, якіх вядзе і пераўтварае Святы Дух, поўных разумення, з шырокім сэрцам і радасным тварам. Больш, чым калі-небудзь, нам патрэбны святары, кансэкраваныя асобы і свецкія вернікі з пільным поглядам апостала, каб усхваляваца і спыніцца пры цяжкасцях і матэрыяльнай і духоўнай галечы, такім чынам, надаючы характэрную рысу шляху евангелізацыі і місіі ацаляючым рытмам блізкасці. Гэты агонь Святога Духа вядзе нас да таго, каб стаць бліжэй да іншых людзей, якія пакутуюць, якія жывуць у нястачы, многіх чалавечых бед, шматлікіх праблем, бежанцаў, мігрантаў, людзей у цяжкасцях. Гэта ўсё той агонь, які зыходзіць з сэрца. Агонь.

Зараз я думаю, перш за ўсё, пра шматлікіх святароў, манахаў і свецкіх вернікаў, якія па ўсім свеце прысвячаюць сябе з вялікай любоўю і адданасцю абвяшчэнню Евангелля, часта нават коштам жыцця. Іх узорнае сведчанне нагадвае нам пра тое, што Касцёл мае патрэбу не ў бюракратах і працавітых функцыянерах, а ў адданых місіянерах, паглынутых стараннасцю прынесці ўсім суцяшальныя словы Езуса і Яго ласкі. Гэта агонь Святога Духа. Калі Касцёл не атрымлівае яго ці не дазваляе, каб ён увайшоў унутр, стане Касцёлам халодным ці толькі прахалодным, няздольным даваць жыццё, бо яго будуюць хрысціяне халодныя або прахалодныя. Варта прысвяціць сёння пяць хвілін, каб кожны з нас задаў сабе пытанне: як выглядае маё сэрца, яно халоднае ці прахалоднае, або, магчыма, яно ў стане прыняць гэты агонь? Прысвецім на гэта пяць хвілін. Гэта будзе карысна для ўсіх нас.

Будзем прасіць Панну Марыю, каб малілася разам з намі і за нас да Нябеснага Айца, каб паслаў да ўсіх вернікаў Святога Духа, Боскі агонь, які запальвае сэрцы і дапамагае нам быць салідарнымі з радасцямі і пакутамі нашых братоў. Няхай умацоўвае нас на нашым шляху прыклад св. Максімільяна Кольбэ, мучаніка любові, успамін якога адзначаецца сёння. Няхай ён навучыць нас жыць агнём любові да Бога і бліжняга».

Пасля малітвы Пантыфік прывітаў вернікаў і папрасіў іх маліцца за яго.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

## СВЯТЫ ХРОСТ

### З радасцю паведамляем, што за апошні час Сакрамант Хросту атрымалі:

***Васіліна Рагулевіч***, дачка Аляксандра і Таццяны
***Соф'я Рымашэўская***, дачка Анатоля і Марыі
***Соф'я Пажога***, дачка Руслана і Анны
***Мірон Барташэвіч***, сын Вадзіма і Інгі
***Мацвей Шышла***, сын Пятра і Аксаны
***Альбіна-Люцыя Коннава***, дачка Дзмітрыя і Марыны
***Анфіса-Аліса Коннава***, дачка Дзмітрыя і Марыны
***Марк Шмідт***, сын Дзмітрыя і Алены
***Іван Абромчык***, сын Валянціна і Анастасіі
***Маргарыта Кіеня***, дачка Мікіты і Любові
***Каміла Марыя Магдалена Дубіцкая***, дачка Аляксандра і Таццяны
***Ганна Гарадзецкая***, дачка Івана і Ларысы
***Яўгенія Жучко***, дачка Аляксандра і Надзеі
***Алёна Шкіндзер***, дачка Аляксандра і Антаніны
***Ева Мелясевіч***, дачка Дзмітрыя і Таццяны
***Дамір-Дамінік Садоўскі***, сын Рамана і Веры
***Максім Вайткун***, сын Геннадзія і Марыны
***Дзмітрый Фёдараў***, сын Аляксея і Алены
***Паліна-Тэрэза Максімчук***, дачка Аляксандра і Юліі
***Даніл-Георгій Бабкевіч***, сын Дзмітрыя і Алены
***Савелій Імбра***, сын Юрыя і Дар'і
***Аўрора-Анна Віжыніс***, дачка Артура і Юліі
***Дзіяна-Анастасія Зароўская***, дачка Юрыя і Наталлі
***Лізавета Гараднік***, дачка Паўла і Вольгі
***Каміла Татук***, дачка Дзяніса і Ірыны
***Яна Трафімава***, дачка Уладзіміра і Святланы
***Глеб Гайшун***, сын Канстанціна і Марыны
***Максім-Георгій Міцкевіч***, сын Арцёма і Веранікі
***Ярослаў-Ян Гарэлаў***, сын Аляксея і Бажэны
***Канстанцін Забаўскі***, сын Дзмітрыя і Вікторыі



## ВІНШУЕМ МАЛАДЫХ

### Давяраем добраму Богу сужэнскае жыццё маладых людзей, якія вырашылі быць заўсёды разам, і просім для іх асаблівага Божага блаславення

Паўла Сумара і Ірыну Каляга
Аляксея Пятроцкага і Аліну Захарчук
Аляксандра Дударчыка і Таццяну Дударчык (Грыгор'еву)
Яна Давідовіча і Аляксандру Алісейчык
Максіма Астрэйку і Юлію Мыслівец
Уладзіміра Трафімава і Святлану Трафімаву
Юрыя Махвіча і Таццяну Слюнькову
Андрэя Жэўняровіча і Кацярыну Гайдук
Дзяніса Малахоўскага і Алу Доля

**СВЯТАЯ ІМША БУДЗЕ АДСЛУЖАНА**

_______ · _______ *2016* *у* _______ · _______ *гадзін*

*у інтэнцыі* ________________________________________________

________________________________________________

| 5 верасня Панядзелак | 6 верасня Аўторак | 7 верасня Серада | 8 верасня Чацвер | 9 верасня Пятніца | 10 верасня Субота | 11 верасня Нядзеля |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.00 – ✞ | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – ✞ | 8.00 – * | 8.00 – * |
| 9.00 – *PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – * | 9.00 – * | 9.00 – ✞ | 9.00 – * |
| 12.00 – * | 12.00 – ✞ | 12.00 – ✞ | 11.00 – S | 12.00 – * | 12.00 – ✞ | 11.00 – S |
| 15.00– Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 12.00 – | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 13.00 – *PL |
| 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 13.00 – *PL | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 15.00 – |
| 19.00 – * | 19.00 – ✞ | 19.00 – ✞ | 15.00 – Вяч PL | 19.00 – * | 19.00 – * | 15.00 – Вяч PL |
| | | | 17.00 – * | | | 16.00 – * |
| | | | 19.00 – ✞ | | | 17.00 – * |
| | | | 21.00 – * | | | 19.00 – * |
| | | | | | | 21.00 – * |

* – Святая Імша ў інтэнцыі аб здароўі, Божым благаславенстве, апецы Маці Божай
✞– Святая Імша ў інтэнцыі памерлых
S – Summa – Святая Імша ў інтэнцыі парафіі
PL – Святая Імша на польскай мове
Вяч – Вячыстая Святая Імша за чыстцовыя душы
**скл** – Святая Імша складковая; **мл** – Святая Імша для моладзі; **слых** – Святая Імша для глуханямых

**Вячыстая Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту** — у капліцы Маці Божай Будслаўскай
**15.00** — Вячыстая Святая Імша ля алтара Божай Міласэрнасці ў інтэнцыі памерлых

## АНОНСЫ

# СВЯТАЯ ЗЯМЛЯ І ВІЛЬНЮС: МІНСКІ ЧЫРВОНЫ КАСЦЁЛ ЗАПРАШАЕ ВЕРНІКАЎ У ПІЛІГРЫМКІ

Цэнтр «Пілігрым» касцёла Св. Сымона і Св. Алены ў верасні-лістападзе арганізоўвае пілігрымкі ў Святую Зямлю і ў Вільнюс да абраза Маці Божай Вастрабрамскай.

Удзельнікі пілігрымкі на Святую Зямлю атрымаюць магчымасць адчуць на сабе дух падзей, якія змянілі лёс чалавецтва, дакрануцца да нямых сведкаў мінулых стагоддзяў Святой Зямлі.

Маліцца і разважаць у Галілеі і Бэтлееме, Юдэі і Ерузалеме. Пілігрымка ў Святую Зямлю – гэта пілігрымка па слядах патрыярхаў, суддзяў і прарокаў, пошук сябе, пошук іншых і надзеі на сустрэчу з Панам.

Абраз Маці Божай Вастрабрамскай шырока шануецца каталікамі ў Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне. Звычайна пілігрымы спяшаюцца ў Вільнюс, каб удзельнічаць ва ўрачыстых набажэнствах 11–16 лістапада.

Колькасць пілігрымаў кожны год расце. Касцёл Св. Сымона і Св. Алены запрашае ў аўтобусную пілігрымку ў Вільнюс, якая адбудзецца 12 лістапада.

У праграме – малітва ў Вострай Браме каля абраза Маці Божай Міласэрнасці, а таксама знаёмства з касцёламі старажытнага Вільнюса.

Віза афармляецца бясплатна. Запіс да 1 кастрычніка па тэлефоне +375 29 611 35 36 або па электронным адрасе info-catholic@mail.ru, а таксама ў цэнтры «Пілігрым» Чырвонага касцёла (памяшканне бібліятэкі касцёла).

тэл. + 375 29 611 35 36, + 375 17 211 36 36, + 375 17 200 56 32 (бібліятэка касцёла)



Голас душы № 8 (533) 2016. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1188. Выдадзена міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 28 студзеня 2016 г.
Заснавальнік: грамадскае аб'яднанне "Хрысціянскае таварыства міласэрднасці". Выдаецца з верасня 2000 г. на беларускай, рускай, лацінскай і польскай мовах.
Галоўны рэдактар – Кс. Уладыслаў Завальнюк, адказны рэдактар – Наталля Лаўрэнка, тэхнічны рэдактар – Кацярына Качарго, карэктар – Аліна Грачухіна.
Падпісны індэкс: 63135.Свабодны кошт.
Адрас рэдакцыі: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 15. Тэл.: (017) 200-44-15, (017) 200-56-32. Факс: (017) 200-55-61, E-mail: vlad_za@tut.by
www.chyrvony.by. Падпісана да друку 28.07.2016. Фармат 60×84 1/8. Надрукавана СТАА "Эвалайн", вул. Рыбалка, 9, оф.23, 220033 г. Мінск.